**Н. М. Шаламіцкая,**
настаўнік беларускай мовы СШ № 1 г. Пінска

**Радаслоўная дзеепрыметніка (7 клас)**

**Мэта:** даць паняцце пра дзеепрыметнік як асобую форму дзеяслова (агульнае значэнне, граматычныя прыметы і сінтаксічная роля).

**Задачы:**

- выпрацоўваць уменне знаходзіць дзеепрыметнікі ў тэксце на аснове іх значэння, марфалагічных прымет і сінтаксічнай ролі;
- фарміраваць навыкі беспамылковага ўжывання дзеепрыметнікаў;
- працягваць работу па фарміраванні ўменняў знаходзіць, параўноўваць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя адзінкі;
- развіваць камунікатыўныя здольнасці вучняў.

**Тып урока**: урок вывучэння новага матэрыялу, першаснага замацавання ведаў і фарміравання уменняў і навыкаў.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны этап**

**II. Матывацыйны этап**

Мне ўспомнілася, як да мяне нядаўна завіталі калядоўшчыкі са словамі “Добры вечар таму, хто ў гэтым даму, добры вечар добрым людзям!” І мне захацелася вас так павітаць, толькі сказаць: “Добры дзень вам, добрыя людзі!” Давайце ўсміхнёмся адзін аднаму, каб усмешкі, як сонейкі, абагрэлі нашы твары гэтым зімовым днём.

***Матывацыйная гутарка, абвяшчэнне тэмы, мэты***

Сёння ў нас даволі незвычайная тэма, я думаю, вы здагадаецеся, пра што мы будзем гаварыць, калі глянеце на план, запісаны на дошцы:

1. Лексічнае значэнне.
2. Граматычныя прыметы.
3. Сінтаксічная роля.

(*Вучні адказваюць, што такі план з'яўляецца на дошцы кожны раз, пры вывучэнні новай часціны мовы)*.

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на запіс на дошцы: ***Актыўны. Дзейны. Скарачае моўнае слова.***

***Дуэт прыметніка і дзеяслова.***

Як вы разумееце лексічнае значэнне слова "дуэт" (*калі нешта выконваецца двума партнёрамі: песня, танец і інш.)*. Часціна мовы, а дакладней – асобая форма дзеяслова, пра якую мы будзем гаварыць, – дзеепрыметнік. Давайце паглядзім на марфемную будову гэтага слова (*два корані)*. Вось чаму – дуэт. А тэма нашага ўрока гучыць не зусім звычайна: "Радаслоўная дзеепрыметніка". Што такое радаслоўная? (*Пералік пакаленняў аднаго роду, які ўстанаўлівае паходжанне і ступень роднасці.)*

***Мэтавызначэнне*** (*з дапамогай апорных слоў*).

**III. Інфарамацыйна-пошукавы этап**

***Праверка дамашняга задання*** (вучні рыхтавалі тэарытычныя паведамленні "Біяграфія дзеяслова" і "Біяграфія прыметніка"; праводзіцца франтальнае апытванне; настаўнік адкрывае дошку, на якой змешчаны кластары).


Абазначае дзеянне
Можа быць любым членам сказа
ДЗЕЯСЛОЎ
Граматычнае значэнне
час
трыванне
зваротнасць
пераходнасць
лад
абвесны
загадны
умоўны
цяперашні
будучы
прошлы
спражэнне
род, лік


РОД
ЛІК
СКЛОН
СІНТАКСІЧНАЯ РОЛЯ
ПРЫМЕТНІК
ЛЕКСІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ
АЗНАЧЭННЕ
ВЫКАЗНІК
РАЗРАДЫ
ЯКАСНЫЯ
АДНОСНЫЯ
ПРЫНАЛЕЖНЫЯ
КАРОТКІЯ
ПОЎНЫЯ
ВЫШЭЙШАЯ
СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ
НАЙВЫШЭЙШАЯ

Практыкаване 35. Назіранне за моўнымі з’явамі: параўноўваем словы *падрыхтаваць – падрыхтаваны, зразумець – зразумелы* і інш. Ставім пытанне, вызначаем, што абазначае першае слова і другое, робім вывад, што *падрыхтаваны* і *зразумелы* абазначаюць прымету паводле дзеяння. Гэта дзеепрыметнікі.

З дапамогай кластара назіраем, што агульнага з дзеясловам, а што – з прыметнікам (для гэтага спрабуем змяніць дзеепрыметнікі). Звяртаемся да да параграфа 5.




Чаму менавіта так сфармулявана тэма ўрока? Параўноўваем тэрміны <u>дзеепрыметнік</u> (бел. мова) і причастие (рус. мова), робім вывад, дзе больш “гаваркі” тэрмін. Заслухваецца некалькі адказаў па кластары пра дзеепрыметнік.

**Фізкультхвілінка.** Калі настаўнік называе прыметнікі, вучні прысядаюць, калі дзеяслоў – падскокваюць, калі дзеепрыметнік – падымаюць рукі ўверх (*падцягнуць, занесены, зелянець, зялёны, пазелянелы, паівелы, пасівець, сівы)*.

**IV. Трэніровачна-карэкцыйны этап**

Практыкаванне 36 і 37 выконваюцца вусна; 1 чалавек каля дошкі працуе з практыкаваннем 40. *(Акружаны, пазелянелы, пачырванелы, расквечаны, пашыраны, зжаўцелы, напісаны, выраблены, прывезены, пасівелы, разгледжаны, зачараваны, пачарнелы, закінуты)*.

2 чалавекі на месцы выконваюць практыкаванне 38. Клас у гэты час працуе з пр. 41 (вусна) і 42 (пісьмова). Праверка выканання заданняў.

**V. Кантрольна-рэфлексійны этап**

Чаму дзеепрыметнік можна назваць *актыўным* і *дзейным*, чаму ён *скарачае моўнае слова,* чаму – *дуэт прыметнік і дзеяслова*?

***Гульня "Так ці не"***

а) Дзеепрыметнік спрагаецца, як дзеяслоў?

б) Як прыметнік, дзеепрыметнік можа змяняцца па родах, ліках і склонах?

в) Як дзеяслоў, дзеепрыметнік можа быць любым членам сказа?

г) У дзеепрыметніках заўсёды пішацца адна літара **н**?

д) Дзеепрыметнік абазначае дадатковае дзеянне?

Самаправерка па ключы на дошцы: а) не, б) так, в) не, г) так, д) не.

Кожны робіць вывад пра ўзровень ведання тэмы.

**VI. Рэфлексія**

- ✓ Што даведаліся новага?
- ✓ Што здалося цяжкім?
- ✓ Што найбольш спадабалася на ўроку?
- ✓ Што здалося нецікавым?
- ✓ Якую адзнаку маглі б паставіць?

(Каменціраванне адзнак.)

***Дамашняе заданне.*** 2 чалавекі атрымліваюць індывідуальнае заданне – скласці "тоўстыя" і "тонкія" пытанні па тэме "Радаслоўная дзеепрыметніка"; пр. 43 (+ у дзеепрыметніках вызначыць час і трыванне); на 9–10 балаў – пісьмова зрабіць апісанне брата(сястры) ці сябра(сяброўкі), выкарыстоўваючы словы з пр. 42.